# ПАРАЎНАННЕ OFFLINE І ONLINE ВЫВУЧЭННЯ МОЎ

*Міронаў У. С.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Пятрова Н.Я. – к.філал.н.,дацэнт*

Артыкул прысвечаны параўнанню offline і online вывучэння моў. Разглядаюцца агульныя тэндэнцыі авалодання замежнымі мовамі, вызначаюцца лепшыя сродкі, якія дапамогуць у працэсе вывучэння моў. Называюцца вартасці і недахопы online і offline вывучэння моў, робяцца высновы пра больш зручныя сродкі.

Лічбавыя тэхналогіі пастаянна развіваюцца з вялікай хуткасцю. Усё больш і больш працэсаў пераходзіць у online-фармат, у тым ліку і адукацыя. У эпоху шматзадачнасці, дзе часу звычайна на ўсё недастаткова, людзям становіцца зручна атрымліваць дадатковыя веды, седзячы перад маніторам камп’ютара ці смартфона, а не на offline-занятках. І, магчыма, у будучыні школы і ўніверсітэты таксама будуць пераходзіць на пашырэнне online-навучання. У гэтай працы мы параўнаем online і offline-метады вывучэння моў. Мы паспрабуем адказаць на наступныя пытанні: наколькі эфектыўныя гэтыя метады, ці варта поўнасцю адмаўляцца ад класічных заняткаў?

Адным з асноўных крытэрыяў пры вывучэнні моў з'яўляецца час. Пры вывучэнні мовы offline ў нас узнікаюць пэўныя выдаткі часу: трэба дабірацца да навучальнай установы (моўнага цэнтра, школы, універсітэта) або да рэпетытара, паколькі гэтыя месцы могуць быць далёка ад дома. Таксама перашкаджаюць пробкі, надвор'е і іншыя фактары. Акрамя гэтага, не заўсёды патрэбныя навучальныя ўстановы ёсць паблізу месца жыхарства, асабліва гэта датычыць вёскі ці сельскага паселішча. Працуючы з персанальным

рэпетытарам, які прыязджае да вас сам, вы пазбаўляецеся ад часу на дарогу, але застаяцеся залежнымі ад графіку заняткаў і фінансавых магчымасцей. У сваю чаргу online-навучанне больш даступна ў фінансавым плане і дае вялікую гнуткасць па часе. Вам не трэба кудысьці ехаць і прытрымлівацца пэўнага раскладу. Вы можыце вучыцца ў зручны час і ў любым месцы. Усё, што вам спатрэбіцца, гэта тэлефон або камп'ютар з доступам у інтэрнэт. Вы самі выбіраеце, калі і дзе будзеце вучыцца [1].

Пры выбары спосабу навучання мы таксама звяртаем увагу на яго кошт. Пры offline-навучанні трэба не толькі плаціць за навучанне, але і за дарогу, і за падручнікі. Вывучаючы мову online, у нас няма крытычных выдаткаў, таму што ў інтэрнэце можна вывучаць мову самастойна або з дапамогай бескаштоўных курсаў. Аднак заўважым, што больш зручныя і карысныя рэсурсы каштуюць грошай. Таксама можна займацца з рэпетытарам па відэаканферэнцсувязі. Напрыклад, можна выкарыстаць вельмі зручную ў гэтых адносінах адукацыйную платформу Moodle (Modular Object-Oriented Dynamic Learning Environment), якая ўяўляе сабой свабодны (распаўсюджваецца па ліцэнзіі GNU GPL) вэб-дадатак і прадастаўляе магчымасць ствараць сайты для разнастайнага online-навучання і арыентавана, перш за ўсё, на арганізацыю ўзаемадзеяння паміж выкладчыкам і навучэнцам, падыходзіць і для online-навучання, і для дадатковай падтрымкі звычайнага вочнага, ці offline, вывучэння моў [2, с. 73].

Вялікую ролю ў працэсе вывучэння моў, на наш погляд, адыгрывае хуткасць камунікацыі з настаўнікам. На online-платформах вы можаце ў любы час задаць пытанне настаўніку, і ён адкажа вам на працягу некалькіх хвілін або гадзін. На групавых занятках у школе або ва ўніверсітэце ёсць пэўны час, калі можна задаць пытанне, гэта не так зручна для навучэнца. Рэпетытар таксама не зможа кругласутачна адказваць вам. І ў абодвух выпадках вам прыйдзецца чакаць наступнага занятку, каб разабрацца ў нейкім пытанні [3].

Для лепшага вывучэння моў патрэбна матывацыя. На offline-занятках у групах вы будзеце матываваныя за кошт іншых вучняў, таму што,назіраючы за імі, вам захочацца імкнуцца не быць горшым за іншых, каб настаўнік заўважыў, што вы таксама ўважлівы і стараецеся. Для таго, каб эфектыўна авалодваць мовай online, вам неабходна навучыцца самаматывацыі, а гэта часам складана. Для падтрымкі больш высокай матывацыі мы раім далучыцца да групы людзей, дзе яны размаўляюць на той мове, якую вы вывучаеце. Зносіны з носьбітамі мовы значна паўплываюць на эфектыўнасць вывучэння мовы, як у offline, так і online-рэжыме.

Разам з тым, звернем увагу на такі факт, што на offline-занятках вы займаецеся ў кабінеце і цалкам пагружаны ў вывучэнне мовы, што дазваляе вам хутчэй развівацца. На online-занятках часта даводзіцца вучыцца ў кафэ або іншых шумных месцах, а дома могуць адцягваць увагу хатнія справы. Тут усё залежыць ад таго, што вам больш падабаецца, дзе вы адчуваеце сябе лепш. У сваю чаргу, некаторым людзям заняткі па відэакнферэнцсувязі дазваляюць стварыць спрыяльную псіхалагічную атмасферу, калі чалаек сціплы ці няўпэўнены ў сваіх здольнасцях.

Таксама лічым, што вельмі важна навучыцца чуць і разумець мову на слых, паколькі кожны чалавек гаворыць з акцэнтам і рознай хуткасцю. На online-занятках можна размаўляць з носьбітамі мовы праз інтэрнэт, а на offline-занятках - з людзьмі асабіста. Гэта дапаможа пераадолець моўны бар'ер. Таксама ёсць розныя праграмы ў інтэрнэце, якія дапамогуць у развіцці ўменняў разумення разнастайнага маўлення на слых. У гэтым дачыненні эфектыўным сродкам для вывучэння моў з'яўляюцца сінтэзатары маўлення, з дапамогай якіх можна ажыццявіць гукапіс розных навучальных тэкстаў і замяніць звыклы для навучэнцаў голас выкладчыка. Прычым сучасныя інструменты дазваляюць гэта зрабіць так, каб гаворка ўспрымалася рознымі галасамі. Для гэтага можна выкарыстаць такія інтэлектуальныя прадукты, як Voicemaker, Apihost, Zvukogram, Robivox, Speechpad і інш. Многія з іх маюць выбар розных моў, галасоў, хуткасці чытання, даўжыні паўз і інш. Часам юнуе опцыя па стварэнні пэўнага настрою, эмацыйнай афарбоўкі, напрыклад, радасць, злосць, разгубленасць і т. п. [4, с. 386].

Offline-заняткі вывучэння моў таксама маюць свае вартасці: дысцыпліна і матывацыя, жывыя кантакты з выкладчыкам і непасрэдная гаворка з людзьмі, магчымасць засяродзіцца толькі на вывучэнні матэрыялу падчас заняткаў, дапамога выкладчыка ў паляпшэнні вымаўлення. Аднак тут ёсць і недахопы, такія як часам высокі кошт заняткаў, выдаткі часу і фінансаў, а таксама складанасць у пошуку патрэбнага настаўніка [5].

Такім чынам, кожнаму чалавеку патрэбна выбіраць спосаб вывучэння моў самому, каб як мага эфектыўнейшым спосабам авалодаць моў з улікам асабістых патрэб і індывідуальных асаблівасцей. І адзін, і другі спосаб вывучэння моў, на наш погляд, мае як недахопы, так і вартасці. Найбольш удалы варыянт, калі ёсць магчымасць сумясціць offline і online вувучэнне, паколькі такі варыянт змешанага навучання, лічым, найбольш прагрэсіўны.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***


1. *Плюсы и минусы изучения языков через интернет [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://elenaruvel.com/obuchenie-v-rezhime-online-plyusy-i-minusy/. – Дата доступа: 20.11.2023.*
2. *Пятрова, Н. Я. Дыстанцыйныя тэхналогіі навучання / Н. Я. Пятрова // Роднае слова. – 2022. – № 6. – С. 72 – 74.*
3. *Плюсы и минусы изучения языков через интернет [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://elenaruvel.com/obuchenie-v-rezhime-online-plyusy-i-minusy/. – Дата доступа: 20.11.2023.*
4. *Петрова, Н. Е. Использование интеллектуальных технологий в обучении русскому языку как иностранному в вузе / Н. Е. Петрова // Цифровая гуманитаристика и технологии в образовании (DHTE 2023): сб. статей IV Международной научно-практической конференции, Москва, 16 – 17 ноября 2023 г. / Под ред. В.В. Рубцова, М.Г. Сороковой, Н.П. Радчиковой. – Москва: ФГБОУ ВО МГППУ, 2023. – С. 381–389.*
5. *Изучения нового языка: плюсы и минусы [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://biog.lingoda.com/ru/plyusy-uznavanie-novoyazyk/. – Дата доступа: 20.11.2023.*